**“Чернобыльскі шлях – дарога жыцця”**

Гэтымі днямі ў краіне працягваецца 23-я Міжнародная сацыяльна-творчая праграма "Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця". Сёлета акцыя праходзіць пад дэвізам "Дарога жыцця па роднай зямлі" па тэрыторыі 24 раёнаў Магілёўскай, Гомельскай, Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай абласцей. Яе ўдзельнікамі сталі больш за 5 тысяч жыхароў. На сцэне разам з артыстамі выступілі больш за 500 таленавітых дзяцей і падлеткаў. Больш падрабязна пра сёлетнюю акцыю мы папрасілі расказаць кіраўніка праекта ад ЦК БРСМ Кацярыну Копелеву.

— Сёлета акцыя стартавала 20 сакавіка ў пасёлку Малеч, што на Брэстчыне. Менавіта там упершыню сустрэліся артысты з таленавітымі юнакамі і дзяўчатамі. Потым акцыя накіравалася па вобласці. У Лунінец, Столін. Пасля мы пераехалі ў Гомельскую вобласць: Брагін, Хойнікі, Добруш, Ветка, Мазыр, Жыткавічы, Лельчыцы. Але, што галоўнае, сёлета ў Гомельскай вобласці працавала не толькі каманда зорных артыстаў, але майстар-клас у Жыткавічах і Лельчыцах паказаў лаўрэат прэміі БРСМ, знакаміты калектыў "Палеская зорачка". Ведаеце, гэта трэба было бачыць, што адбывалася ў Лельчыцах, Жыткавічах. Сабралі ўсіх педагогаў, таленавітых дзетак, настаўнікаў, кіраўнікоў творчых калектываў. І, вядома ж, тое, што з "Палескай зорачкай" выехаў наш знакаміты кампазітар, якога любіла і любіць сённяшняя моладзь — Эдуард Ханок. Гэта надало нашай праграме шарм. Можаце сабе ўявіць, у Лельчыцах мы стаялі на сцэне і зала стаяла. Ужо ў канцы я кажу: "Дык, можа, пачнём спачатку?" — і прагучалі бурныя авацыі. Гэта значыць, людзі былі гатовыя глядзець новую праграму. І, безумоўна, нас добра сустракалі і ў пасёлку Касцюкоўка... Паўсюль нас сустракалі мясцовыя таленты. Як заўсёды, спачатку выступалі "зоркі" раёна, потым краіны, і ўсё завяршалася сумесным канцэртам. І я нават не магу сказаць, дзе прымалі лепш за ўсё. Усюды было настолькі цудоўна, што 10 дзён гэтай акцыі праляцелі як адно імгненне.

— Як падбіраўся склад выканаўцаў?

— Вы ведаеце, сёлета быў эксклюзіўны склад. Праўда, гэта кожны год гавораць. Вось летась было добра, але сёлета было проста незабыўна. Аднак каманда насамрэч справе была магутная. Гэта быў творчы калектыў "Купалінка", Лілія Студнева, Таццяна Моўчан, наша кампазітарка, музыкант і спявачка і яе новая моладзевая група "Лэст". Яны ўсе залы зачароўвалі. Таму што ў кожнай зале было шмат моладзі, і, зразумела, гэта былі іх артысты. А калі выходзіў Эдуард Ханок, залы ўставалі. Ведаеце, я правяла тысячу праграм з музыкантамі, кампазітарамі, але ўпершыню было так. Выходзіць кампазітар без фанаграм і кажа: "Вы, можа, мяне не ўсе ведаеце, але, думаю, помніце мае песні". І зала спявала з ім кожную песню. Я ў кожным раёне адчувала гонар за арганізатараў (а гэта БРСМ, Беларускі дзіцячы фонд, Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС МНС) гэтай акцыі. Не таму, што яны гэта робяць, а таму, што гэта робяць раёны, наша моладзь, дзеці. Яны чакаюць не гасцей, а аднадумцаў, таму, што яны ведаюць, што іх творчасць будзе адзначана. Вось так гэта было. І цяпер мы з вялікай радасцю праедзем па дзіцячых рэабілітацыйных цэнтрах. Пабывалі ў Ждановічах, у пасёлках Вішнёўка, Чысць, у Валожынскім раёне.

— Як плануецца правесці закрыццё акцыі?

— Сёлета закрыццё пройдзе 26 красавіка ў Івянцы, як і 2 гады таму. Нагадаю, летась закрыццё прайшло ў Белдзяржфілармоніі. Увогуле, у фінале акцыі мы ўсіх дзяцей напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей запросім у Мінск на тры дні. Гэта ўжо будзе 15-е рэспубліканскае свята мастацтваў "У будучыню з надзеяй". А ў Івянцы нас будуць сустракаць многія сапраўдныя зоркі. Гэта студэнты ВНУ краіны, усе мясцовыя зоркі раёна, якія ўдзельнічалі ў іншых праграмах "Дарогі жыцця". А ўсіх дзяцей мы будзем сустракаць у маі ў сталіцы. І самае галоўнае, што яны чакаюць гэтага свята. Многія пасля сумесных канцэртаў падыходзілі і пыталі: "А я паеду ў Мінск?". Для дзяцей гэта насамрэч форум. Не тое, што мы чакаем ад іх канцэртаў, хоць яны таксама

выступаюць. Гэта свята сустрэчы са сталіцай, з артыстамі, музыкантамі, і яны чакаюць гэтага.

Дарэчы, за 23 гады існавання Міжнароднай сацыяльна-творчай праграмы "Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця" ў 29 раёнах, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, а таксама ў раёнах-пабрацімах Расіі і Украіны праведзены тысячы канцэртаў вядомых артыстаў і творчых калектываў рэспублікі, аказана адрасная падтрымка ў тэхнічным абсталяванні музычным школам і цэнтрам творчасці. Галоўны вынік "Дарогі жыцця" — вялікая прафесійная дапамога таленавітым дзецям і падлеткам, якую ўдзельнікі акцыі штогод аказваюць на месцах і затым пастаянна дапамагаюць сваім падапечным у іх творчым росце і станаўленні. Дзякуючы гэтай праграме на вялікую сцэну краіны выйшлі такія вядомыя артысты, як Стэла, Паліна Смолава, Ягор Волчак, Аляксандр Заўгародні, Андрэй Шумак і іншыя. Многія творчыя калектывы прымаюць удзел па магчымасці ў кожнай праграме. Да прыкладу, фолк-гурт "Купалінка" Белдзяржфілармоніі сёлета 8-ы раз праехаў па раёнах разам з акцыяй. Расказвае мастацкі кіраўнік калектыву, заслужаная артыстка Беларусі Алена Цялькова.

— Гэта вельмі значная акцыя святла і дабрыні, якая дае шмат радасці жыхарам малых вёсак і раённых цэнтраў, і мы гэта адчуваем па перапоўненых залах, па энергетыцы шчасця, па бясконцых апладысментах. Залы ўстаюць. Ну і адзін са складнікаў праграмы — выяўленне, адбор таленавітых дзяцей і маладых людзей. Для кіраўнікоў творчых калектываў, бацькоў і жыхароў гарадоў гэта падзея. Дзеці выступаюць на адным канцэрце з прафесійнымі артыстамі. І лепшыя будуць запрошаны ў сталіцу, дзе сваім майстэрствам парадуюць мінчан. Дзеці — гэта будучыня нашай краіны. Таленавітыя дзеці — духоўны, творчы патэнцыял краіны. Вельмі важна выявіць талент, развіць яго творчы патэнцыял і стварыць усе ўмовы для гэтага. І я ўпэўнена, што з часам гэтыя маленькія зорачкі вырастуць у вялікіх зорак і будуць упрыгожваць мастацтва нашай краіны. Гэта акцыя, якую чакаюць. І мы, артысты, вельмі рады, што маем магчымасць сустракацца з людзьмі, прыгожымі, моцнымі, шчаслівымі людзьмі.

Народны артыст Беларусі, кампазітар Эдуард Ханок сёлета ўпершыню ўзяў удзел у акцыі "Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця". І для сябе вызначыў, што, калі запросяць яшчэ раз, абавязкова паедзе зноў.

— Уражанні самыя моцныя. Забягаючы наперад, калі б мне сказалі, што праз пару дзён у нас зноў выезд, я спакойна б паехаў. Таму што для мяне гэтых дзесяці дзён не было. Я іх проста не заўважыў. Па-першае, выдатная арганізацыя. Дынаміка, не было паслабленняў, калі ты не ведаеш, куды сябе дзець. Па-другое, абсалютная псіхалагічная сумяшчальнасць калектываў. Гэта вельмі важна. У нас ніводнага нават мікраканфлікту не было. А, калі развіталіся, усе гаварылі пра любоў адно да аднаго, дружбу. Для мяне гэта моцная зарадка.

— Як вы думаеце, чаму такія акцыі неабходны?

— Па-першае, таму, што народ трэба прасвятляць. Па-другое, важна, як ты зрабіў гэту акцыю, якая самааддача. У нас не было канкурэнцыі, хто лепшы. Была адна праграма. Усё ішло ў адну скарбоначку. Таму, калі запросяць яшчэ раз, паеду з задавальненнем.

***Святлана Сухарко.***

**Источник:** Звязда.-2009.-24 крас.-С.3.